ВОЛЬНЫЙ ТРУД
Б-лосток
1 СЕН 40

# ГАСТРОЛІ БЕЛАСТОЦКІХ КАЛЕКТЫВАЎ

У Маскве закончыліся гастролі Беластоцкага яўрэйскага тэатра мініяцюр пад мастацкім кіраўніцтвам Джыгана і Шумахера. Тэатр паказаў масквічам дзве праграмы: «Напяваючы і танцуючы» і «Ізюм з міндалем», якія ўключаюць у сябе невялікія сцэнкі, скетчы, у асноўным высмейваючы стары ўклад местачковага быту.

Гастролі тэатра карысталіся вялікай папулярнасцю ў гледачоў. Маскоўскія тэатральныя крытыкі адзначылі высокае мастацкае майстэрства яго калектыва. Зараз калектыў тэатра выехаў на гастролі па гарадах СССР.

Дзяржаўны джаз-аркестр БССР пад кіраўніцтвам Эдзі Рознер пасля гастролей у Ленінградзе, Одэсе і Растове зараз з поспехам выступае ў тэатры маскоўскага «Эрмітажа». З Масквы калектыў выедзе на гастролі па гарадах СССР.